(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

УДК 830(436)(092)(043.3)

Гурло Вольга Чаславаўна

# ХРАНАТОП ПРОЗЫ ІНГЕБОРГ БАХМАН

10.01.03 – літаратура народаў краін замежжа
(аўстрыйская)

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск – 2004

# (ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт Е.А. Лявонава, Беларускі дзяржаўны універсітэт, кафедра замежнай літаратуры

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук, прафесар А.А. Гугнін, Полацкі дзяржаўны універсітэт, кафедра сусветнай літаратуры і культуралогіі;

кандыдат філалагічных навук, дацэнт Г.Я. Адамовіч, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка, кафедра беларускай літаратуры

Абарона адбудзецца 12 сакавіка 2004 г. ў 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 у Беларускім дзяржаўным універсітэце (220050, Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, ауд. 62; тэл. вучонага сакратара: 222-33-66).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы « 9 » лютага 2003 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
прафесар А.І. Бельскі

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** У канцы XX ст. у германістыцы ўзрасла цікавасць да аўстрыйскай літаратуры. Па справядлівым меркаванні сучасных даследчыкаў, яна не губляецца ў нямецкай літаратуры, а існуе як самастойная з'ява, абумоўленая асаблівасцямі сацыяльна-гістарычнага і культурнага развіцця краіны. У сувязі з гэтым актуальным для сучаснага літаратуразнаўства ўяўляецца даследаванне творчасці Інгеборг Бахман (1926–1973). Яе дзейнасць як паэта, празаіка, перакладчыка і драматурга – заўважная з'ява ў літаратуры Аўстрыі 1950–70-х гг. Дадзеная дысертацыйная работа напісана па выніках аналізу хранатопнай (прасторава-часавай) структуры прозы І. Бахман.

Аналіз нямецка- і рускамоўных работ, прысвечаных І. Бахман, выявіў недастатковую вывучанасць хранатопу яе празаічных твораў. Між тым праблематыка часу і прасторы заўсёды была прынцыпова важнай для самой пісьменніцы. З аднаго боку, пра гэта сведчаць яе тэарэтычныя працы (дысертацыя на атрыманне навуковай ступені доктара філасофіі і шэраг эсэ па філасофіі Л. Вітгенштэйна), у якіх пытанням часу і прасторы надаецца значная ўвага. З іншага боку, розныя складнікі хранатопу нярэдка выконваюць структура- і сэнсаўтваральную функцыю ў мастацкіх творах І. Бахман. Такім чынам, шматбаковае і цэласнае даследаванне прасторава-часавай будовы празаічных твораў пісьменніцы актуальнае і неабходнае для больш глыбокага асэнсавання яе творчага метаду.

Апрача таго, паколькі ў беларускім літаратуразнаўстве навуковыя даследаванні творчасці І. Бахман цалкам адсутнічаюць, а ўся ўвага да яе пакуль абмяжоўваецца толькі перакладамі аднаго яе апавядання і двух вершаў, аналіз прозы пісьменніцы як першае айчыннае манаграфічнае даследаванне творчасці дадзенага аўтара таксама абумоўлівае актуальнасць дысертацыі.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя напісана ў межах навуковай тэмы кафедры замежнай літаратуры Белдзяржуніверсітэта «Сусветная літаратура: праблемы стылю» (№ 20012485, 2001–2005 гады выканання).

**Мэта і задачы дысертацыйнага даследавання.** Мэтай даследавання з'яўляецца вызначэнне структура- і сэнсаўтваральнай ролі прасторава-часавых характарыстык прозы І. Бахман.

Для дасягнення пастаўленай мэты аўтарам вызначаны наступныя задачы:

- выявіць вызначальныя аспекты хранатопнай структуры апавяданняў і рамана пісьменніцы;
- прасачыць эвалюцыю творчага метаду пісьменніцы на прыкладзе хранатопнай структуры яе твораў;
- вызначыць ролю прасторава-часавых характарыстык у фарміраванні ідэйна-мастацкіх асаблівасцей празаічных твораў;

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


- прааналізаваць месца пэўных складнікаў хранатопу ў мастацкай парадыгме пісьменніцы;
- выявіць ступень абумоўленасці паэтыкі І. Бахман індывідуальнымі (біяграфія) і надындывідуальнымі элементамі (філасофскія канцэпцыі, літаратурны стыль эпохі).

**Аб'ект і прадмет даследавання.** У якасці аб'екта даследавання выбрана мастацкая проза І. Бахман: зборнікі апавяданняў «Трыццаты год» (1961) і «Сінхронна» (1972), а таксама раман «Маліна» (1971).

Прадмет даследавання – асаблівасці прасторава-часавай структуры разгледжаных твораў і яе функцыянальная значнасць.

**Метадалогія і метады правядзення даследавання.** Метадалагічную базу дысертацыі складае структурна-семіятычны метад даследавання мастацкага тэксту (Ю.М. Лотман і інш.). Асноўным аб'ектам увагі пры гэтым з'яўляюцца творы пісьменніцы, аднак яны разумеюцца не як ізаляваны і самадастатковы прадмет, а ва ўзаемадзеянні з пазатэкставымі элементамі.

Апрача таго, у рабоце выкарыстоўваліся: а) параўнальна-тыпалагічны метад, які дазволіў прааналізаваць суадносіны ў творах І. Бахман элементаў традыцыі і наватарства, агульнага і прыватнага; б) метады сінхроннага і дыяхроннага аналізу; в) постструктуралісцкая тэорыя інтэртэкстуальнасці (Р.Барт); г) сістэмна-функцыянальны метад (вывучэнне тэматычна-вобразнай спецыфікі твора, якая мае вялікае значэнне і як кампанент агульнага патэнцыялу аўстрыйскай літаратуры, і як складнік індывідуальнага стылю пісьменніцы); д) метады фармалізацыі, тыпалагізацыі і класіфікацыі.

**Навуковая навізна і значнасць вынікаў.** Навуковая навізна работы заключаецца ў тым, што

– дысертацыя з'яўляецца першым у айчынным літаратуразнаўстве манаграфічным даследаваннем творчасці І. Бахман;
– упершыню праведзены цэласны аналіз хранатопу мастацкай прозы пісьменніцы;
– у дысертацыі вызначана функцыя прасторава-часавай структуры ў стварэнні адметнага ідэйна-тэматычнага малюнка апавяданняў і рамана І. Бахман;
– прааналізавана абумоўленасць прасторава-часавых асаблівасцей прозы І. Бахман некаторымі плынямі заходнееўрапейскай філасофіі XX ст., стылёвымі тэндэнцыямі літаратуры XX ст. і асабістым досведам пісьменніцы.

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі вызначаецца спробай канкрэтызацыі асаблівасцей індывідуальнага творчага метаду І. Бахман.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі даследавання могуць быць скарыстаны: для далейшых навуковых распрацовак у галіне вывучэння прасторава-часавай структуры празаічнага твора; у вучэбных дапаможніках для студэнтаў філалагічных факультэтаў; у педагагічнай рабоце пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў па гісторыі замежнай літаратуры XX ст. і

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


спецкурсаў па аўстрыйскай літаратуры XX ст.; у правядзенні спецсемінараў і практычных заняткаў па тэмах «Творчасць Інгеборг Бахман», «Прастора і час у мастацкім творы».

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Прасторава-часавыя характарыстыкі выконваюць асноваўтваральную ролю ў прозе І. Бахман і вызначаюць тэмпаральныя і тапаграфічныя мадэлі, у якіх адлюстроўвасцца ідэйна-тэматычная спецыфіка твораў.

2. У апавяданнях І. Бахман адбываецца ўзаемадзеянне розных часавых пластоў на ўзроўні семантыкі зместу і кампазіцыі; эвалюцыя паэтыкі пры гэтым выяўляецца на абодвух узроўнях і абумоўліваецца індывідуальнымі і надындывідуальнымі элементамі.

3. Апавяданні І. Бахман розных гадоў аб'яднаны ў ідэйна-тэматычным плане пры дапамозе скразнога тапаграфічнага лейтматыву і адрозніваюцца шэрагам структурных асаблівасцей.

4. Адной з асноўных рыс паэтыкі І. Бахман з'яўляецца падкрэсленая суб'ектывізацыя аповеду, якая ў найбольшай ступені рэалізуецца ў хранатопнай структуры рамана «Маліна».

5. Прасторава-часавыя асаблівасці рамана «Маліна» дазваляюць канстатаваць наяўнасць у ім трох варыянтаў хранатопу, кожны з якіх служыць для рэалізацыі пэўнай эстэтычнай задачы.

6. Своеасаблівая аўтабіяграфічнасць кніг І. Бахман адлюстроўвае характар эпохі, у якую яны ствараліся.

**Асабісты ўклад дысертанта.** Вынікі дысертацыйнага даследавання атрыманы аўтарам самастойна на аснове вывучэння і сістэматызацыі навуковай літаратуры і аналізу літаратурна-крытычнай і мастацкай спадчыны І. Бахман. Уласна дысертантам у творах пісьменніцы вылучаны сэнсавыя і структурныя ўзроўні, на якіх рэалізуюцца розныя варыянты хранатопу, а таксама выяўлены тэмпаральныя і тапаграфічныя мадэлі, што ляжаць у аснове прасторава-часавай структуры разгледжаных тэкстаў. Выніковым стала таксама даследаванне асобных матываў і вобразаў як складнікаў мастацкага часу і прасторы ў творах І. Бахман.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Прамежкавыя і канчатковыя вынікі праведзенага даследавання былі прадстаўлены на наступных міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях у перыяд з 2001 па 2003 гг.: «Філалагічныя навукі: Маладыя вучоныя ў пошуку» (Белдзяржуніверсітэт, Мінск, 20 красав. 2001 г., 25 красав. 2003 г.); «Традиционное и новаторское в преподавании литературы в школе и вузе» (Брэсцкі дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, Брэст, 20–21 лістап. 2001 г.); Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность)» (Віцебскі дзярж. ун-т імя П.М. Машэрава, Віцебск, 6–8 снеж. 2001 г.); І і ІІ Міжнародных літаратуразнаўчых канферэнцыях «Русская, белорусская и мировая литература:

история, современность, взаимосвязи" (Полацкі дзярж. ун-т, Наваполацк, 29–31 сакав. 2002 г., 2–5 красав. 2003 г.); IV міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных (Брэсцкі дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, Брэст, 15–17 мая 2002 г.); III Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мова – літаратура – культура", прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа (Белдзяржуніверсітэт, Мінск, 27–28 верас. 2002 г.); VII рэспубліканскай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Беларусі (НДРС–2002) (Полацкі дзярж. ун-т, Наваполацк, 20–21 лістап. 2002 г.); "Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання настаўнікаў XXI стагоддзя" (БДПУ імя М. Танка, Мінск, 6 снеж. 2002 г.); Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности" (Віцебскі дзярж. ун-т імя П.М. Машэрава, Віцебск, 30–31 кастр. 2003 г.).

**Апублікаванасць вынікаў.** Па тэме даследавання апублікавана 14 работ, у тым ліку 6 артыкулаў у навукова-тэарэтычных часопісах і зборніках. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў – 66 с.

**Структура і аб'ём работы.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (271 найменне). Поўны аб'ём работы – 117 старонак, асноўны тэкст размешчаны на 99 старонках.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **Уводзінах** абгрунтоўваецца актуальнасць выбранай тэмы, даецца агляд перакладаў творчай спадчыны І. Бахман на рускую і беларускую мовы, акрэсліваецца кола праблем, што патрабуюць навуковага даследавання.

У **Першым раздзеле** дысертацыі – **"Часава-прасторавыя ўяўленні ў мастацкім творы"** – сістэматызаваны тэарэтычныя даследаванні па пытанні хранатопу і навуковыя работы, прысвечаныя творчасці І. Бахман.

**Падраздзел 1.1. "Праблема хранатопу ў сучасным літаратуразнаўстве"** змяшчае ў сабе сціслы экскурс у гісторыю навуковай літаратуры, што даследуе часава-прасторавую праблематыку мастацкага твора.

Адзінства прасторы і часу ў сучаснай філалагічнай навуцы абазначаецца тэрмінам "хранатоп", у даслоўным перакладзе – "часапрастора". Упершыню ў літаратуразнаўстве гэты тэрмін з'явіўся ў працы М.М. Бахціна "Формы времени и хронотопа в романе: (Очерки по исторической поэтике)"[1], напісанай у 1937–1938 гг. Катэгорыя хранатопу запазычана даследчыкам з матэматычнага прыродазнаўства і абапіраецца на паняцце прасторава-часавага кантынуума эйнштэйнаўскай фізікі. У дачыненні да літаратуры М.М. Бахцін разглядае хранатоп як тып мастацкай рэальнасці, уласцівы кожнаму жанру. Даследчык

[1] Бахтин М.М. Формы времени и хронотопа в романе: (Очерки по исторической поэтике) // Бахтин М.М. Эпос и роман. – СПб., 2000. – С. 9–193.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



вызначае тыпалогію хранатопаў, пры дапамозе якой паказвае развіццё раманнага жанру на працягу некалькіх стагоддзяў.

Побач з тэорыяй хранатопу М.М. Бахціна асновы аналізу прасторы і часу мастацкага свету распрацоўваліся і іншымі даследчыкамі. У прыватнасці, прынцыповае значэнне для літаратуразнаўства мела і мае кніга Д.С. Ліхачова «Поэтика древнерусской литературы»[2], надрукаваная ў 1967 г. Яе раздзелы «Поэтика художественного времени» і «Поэтика художественного пространства» шмат у чым паклалі пачатак аналізу прасторава-часавых структур мастацкага свету.

У другой палове 1960–70-х гг. час і прастора робяцца прадметам грунтоўнага вывучэння з боку тартуска-маскоўскай літаратуразнаўчай школы; з прац яе прадстаўнікоў першарадна значнымі з'яўляюцца даследаванні Ю.М. Лотмана[3]. Апрача таго, у гэтыя гады тыпалогію мастацкага часу дэтальна распрацоўвае М.К. Гей[4]. Вялікае значэнне для даследавання праблемы хранатопнай структуры літаратурнага твора меў таксама праведзены ў 1970 г. сімпозіум «Проблемы ритма, художественного времени и пространства в литературе и искусстве» і выдадзены на яго аснове зборнік «Ритм, пространство и время в литературе и искусстве»[5]. Пераважная большасць артыкулаў зборніка прысвечана тэарэтычнаму аналізу мастацкіх прасторы і часу.

У 80–90-я гг. XX ст. пытанні мастацкага часу і прасторы выклікаюць цікавасць з боку шматлікіх літаратуразнаўцаў. Актыўна вывучаюцца як тэарэтычныя аспекты хранатопу, так і асаблівасці прасторава-часавай структуры канкрэтных твораў. Значная колькасць падобных прац аб'яднана ў зборніках, выдадзеных у розныя гады ў Даўгаўпілскім універсітэце[6].

Трэба заўважыць, што да праблемы часу і прасторы ў мастацкім тэксце існуюць розныя падыходы. Так, частка даследчыкаў гавораць пра непадзельную еднасць часу і прасторы[7]. Іншыя больш мэтазгодным лічаць вывучэнне кампанентаў хранатопу асобна, незалежна адзін ад аднаго; пры гэтым больш распрацаваным застаецца мастацкі час[8].

---

[2] Лихачев Д.С. Поэтика древнерусской литературы. – Л., 1967.

[3] Лотман Ю.М. Структура художественного текста // Лотман Ю.М. Об искусстве. – СПб., 1998. – С. 14–285.

[4] Гей Н.К. Поэтическое время и пространство // Гей Н.К. Художественность литературы. Поэтика. Стиль. – М., 1975. – С. 252–282.

[5] Ритм, пространство и время в литературе и искусстве. – Л., 1974.

[6] Пространство и время в литературе и искусстве: Метод. материалы по теории литературы. – Даугавпилс, 1984, 1987, 1990.

[7] Енукидзе Р.И. Художественный хронотоп и его лингвистическая организация. – Тбилиси, 1987; Мотылева Т.Л. О времени и пространстве в современном романе // Мотылева Т.Л. Достояние современного реализма. – М., 1973. – С. 379–398; Роднянская И.Б. Художественное время и художественное пространство // Литературная энциклопедия терминов и понятий / Под ред. А.Н. Николюкина. – М., 2001. – Стб. 1174–1177, і інш.

[8] Ржевская Н.Ф. Концепция художественного времени в современном романе // Филологические науки. – 1970. – № 4. – С. 28–40; Тураева З.Я. Категория времени. Время грамматическое и время художественное (на материале английского языка). – М., 1979, і інш.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках


1. Гурло В.Ч. Прасторава-часавая будова рамана Інгеборг Бахман "Маліна" (1971) // Весн. Бел. дзярж. ун-та. Сер. 4: Філал. Журн. Пед. – 2003. – № 1. – С. 27–32.
2. Гурло В.Ч. Адлюстраванне катэгорыі міжпрасторавасці ў апавяданнях Інгеборг Бахман: матыў блукання і вобраз радзімы // Іноземна філологія: Український науковий збірник. Вип. 114 / Львівск. нац. ун-т ім. І. Франка; Наук. рэд. вып. проф. Н.Х. Копистянська. – Львів: Львівск. нац. ун-т, 2003. – С. 255–263.
3. Гурло В.Ч. Прасторава-часавая будова апавяданняў І. Бахман (зборнікі "Трыццаты год" і "Сінхронна") // Труды кафедры зарубежной литературы БГУ. Вып. 1 / Под ред. В. Халипова и др. – Минск: РИВШ БГУ, 2003. – С. 83–89.
4. Гурло О.Ч. Модели интегрирующего и обратимого времени в рассказах И. Бахман // Аспирант и соискатель. – 2003. – № 4. – С. 34–36.
5. Гурло О.Ч. Время историческое и время художественное в романе Ингеборг Бахман "Малина" // Проблемы истории литературы: Сб. ст. Вып. семнадцатый / Отв. ред. А.А. Гугнин. – Москва – Новополоцк, 2003. – С. 92–101.
6. Гурло О.Ч. Хронотоп прозы Ингеборг Бахман: вписанность индивидуальных творческих установок в литературный контекст эпохи // Вопр. филол. наук. – 2003. – № 4. – С. 19–21.


### Матэрыялы і тэзісы навуковых канферэнцый


7. Гурло В.Ч. Адлюстраванне хранатопу мажлівага ў перакладзе апавядання Інгеборг Бахман "Крок да Гаморы" // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность): Материалы междунар. науч.-теорет. конф., Витебск, 6-8 дек. 2001 г. / Редкол.: А.В. Космач и др. – Витебск: Изд-во ВГУ им. П.М. Машерова, 2001. – С. 392–395.
8. Гурло В.Ч. Вобраз Вены ў прозе Інгеборг Бахман // IV межвузовская науч.-метод. конф. молодых ученых, 15–17 мая 2002 года: Сб. материалов / Под общ. ред. В.С. Секержицкого. – Брест: БрГУ им. А.С.Пушкина, 2002. – С. 103–104.
9. Гурло В.Ч. Асаблівасці мастацкага часу ў апавяданнях І. Бахман // Мова – літаратура – культура: Матэрыялы III Міжнар. навук. канф., прысв. 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа (Мінск, 27-28 верас. 2002 г.): У 2 т. / Рэд. кал.: З.І. Бадзевіч і інш. – Мінск: БДУ, 2002. – Т. 1. – С. 106–110.
10. Гурло В.Ч. Вобразы суб'ектыўнага часу апавядальніцы ў рамане І. Бахман "Маліна" // Великие преобразователи естествознания: Леонардо да Винчи:

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


ХУIII Междунар. чтения. 20–21 нояб. 2002 г., Минск: Тез. докл. / Отв. ред. И.Ф. Габрусь. – Минск: БГУИР, 2002. – С. 155–158.

11. Гурло В.Ч. Асаблівасці мастацкай прасторы ў апавяданнях Інгеборг Бахман // Материалы VII Респ. науч. конф. студентов и аспирантов Беларуси (НИРС–2002): В 3 т. / Полоцкий гос. ун-т. – Новополоцк, 2003. – Т. 2. – С. 47–48.
12. Гурло В.Ч. Адлюстраванне гістарычнага досведу ў рамане І. Бахман “Маліна” // Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання настаўнікаў XXI стагоддзя: Матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 6 снеж. 2002 г. / Пад навук. рэд. А.А. Кавалені і В.Ф. Касовіча. - Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2003. – С. 161–163.
13. Гурло В.Ч. Гісторыя Аўстрыі як аснова падання пра прынцэсу Каграпскую ў рамане І. Бахман “Маліна” // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности: Материалы междунар. науч.-теорет. конф., Витебск, 30–31 окт. 2003 г. / Редкол.: А.В. Космач и др. – Витебск: Изд-во УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, 2003. – С. 30–31.
14. Гурло В.Ч. Топас спабачання ў рамане І. Бахман “Маліна” // Філалагічныя навукі: Маладыя вучоныя ў пошуку: Матэрыялы канф. (Мінск, 25 красав. 2003 г.) / Адк. рэд. С.А. Важнік. – Мінск.: ВТАА “Права і эканоміка”, 2003. – С. 41–45.



(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## РЭЗЮМЭ

Гурло Вольга Чаславаўна

Хранатоп прозы Інгеборг Бахман

**Ключавыя словы:** хранатоп, час, прастора, інтэгравальны час, абарачальны час, успамін, гістарычны досвед, мінулае, цяперашняе, будучае, міжпрасторавасць, блуканне, радзіма, аўтабіяграфічнасць, інтэртэкстуальнасць.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца мастацкая проза І. Бахман: два зборнікі апавяданняў і раман «Маліна». Прадмет даследавання – асаблівасці прасторава-часавай структуры твораў і яе функцыянальная значнасць.

У рабоце здзейснены аналіз прозы І. Бахман з мэтай вызначэння структура- і сэнсаўтваральнай ролі ў ёй прасторава-часавых характарыстык. Для гэтага прааналізавана месца складнікаў хранатопу ў архітэктоніцы аповеду і ў фарміраванні ідэйна-тэматычнага зместу твораў. Метадалагічную аснову работы склаў структурна-семіятычны метад вывучэння мастацкага тэксту.

Дысертацыя з'яўляецца першым беларускім манаграфічным даследаваннем творчасці І. Бахман і ўтрымлівае першы цэласны аналіз хранатопу яе мастацкай прозы. У рабоце асэнсавана істотная роля прасторава-часавых характарыстык апавяданняў і рамана І. Бахман у раскрыцці галоўных тэм творчасці пісьменніцы – экзістэнцыяльнага крызісу сучаснага чалавека і разумення грамадства як забойцы чалавечай асобы. Гэта роля выяўлена пры дапамозе вылучэння сэнсавых і структурных узроўняў тэкстаў, на якіх рэалізаваны розныя варыянты хранатопу, а таксама тэмпаральных і тапаграфічных мадэляў, што ляжаць у аснове прасторава-часавай структуры разгледжаных твораў. У дысертацыі паказана абумоўленасць хранатопных асаблівасцей прозы пісьменніцы пэўнымі плынямі заходнееўрапейскай філасофіі XX ст., стылёвымі тэндэнцыямі літаратуры XX ст. і асабістым досведам аўтара.

Вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны для далейшых распрацовак у галіне вывучэння хранатопу мастацкага твора, пры падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў, лекцыйных курсаў і семінарскіх заняткаў па гісторыі замежнай і аўстрыйскай літаратуры XX ст.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## РЕЗЮМЕ

Гурло Ольга Чеславовна

Хронотоп прозы Ингеборг Бахман

**Ключевые слова:** хронотоп, время, пространство, интегрирующее время, обратимое время, воспоминание, исторический опыт, прошлое, настоящее, будущее, межпространственность, блуждание, родина, автобиографичность, интертекстуальность.

Объектом исследования является художественная проза И. Бахман: два сборника рассказов и роман «Малина». Предмет исследования – особенности пространственно-временной структуры произведений и ее функциональная значимость.

В работе проведен анализ прозы И. Бахман с целью определения структуро- и смыслообразующей роли в ней пространственно-временных характеристик. Для этого проанализировано место составляющих хронотопа в архитектонике повествования и в формировании идейно-тематического содержания произведений. Методологическую основу работы составил структурно-семиотический метод изучения художественного текста.

Диссертация является первым белорусским монографическим исследованием творчества И. Бахман и содержит первый целостный анализ хронотопа ее художественной прозы. В работе осмыслена существенная роль пространственно-временных характеристик рассказов и романа И. Бахман в раскрытии главных тем творчества писательницы – экзистенциального кризиса современного человека и понимания общества как убийцы человеческой личности. Эта роль выявлена при помощи выделения смысловых и структурных уровней текстов, на которых реализованы различные варианты хронотопа, а также темпоральных и топографических моделей, лежащих в основе пространственно-временной структуры рассмотренных произведений. В диссертации показана обусловленность хронотопных особенностей прозы писательницы определенными течениями западноевропейской философии XX в., стилевыми тенденциями литературы XX в. и личным опытом автора.

Результаты проведенного исследования могут быть использованы для дальнейших разработок в области изучения хронотопа художественного произведения, при подготовке учебных пособий, лекционных курсов и семинарских занятий по истории зарубежной и австрийской литературы XX в.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



## SUMMARY

Hurlo Volha Chaslavauna

Chronotope of Ingeborg Bachmann's prose

**Key words**: chronotope, time, space, integrating time, reversible time, recollection, historical experience, past, present, future, interspatiality, wandering, homeland, autobiographicality, intertextuality.

The object of the research is Ingeborg Bachmann's prose, i.e. two collections of short stories and the novel «Malina». The subject of the research is the space-time structure of her works, namely, its peculiarities and its functional significance.

The purpose of the thesis is to determine syntactic and semantic roles of time-space characteristics in Bachmann's prose. In order to do that, the position of the chronotope's constituents in the archtonic of the narrative as well as their contribution into the forming of the conceptual and thematic content of the works were analysed. For the methodological basis of the research the structural/semiotic method of text analysis was used.

The dissertation is the first ever Belorussian monographic research of Ingeborg Bachmann's works and contains the first complete analysis of Bachmann's prose chronotope. The thesis reveals the way the writer uses the time and space characteristics in her stories and the novel in order to elaborate on the main themes of her works. The latters are the existential crisis of a modern human being and the role that society plays in it, namely, the author considers the society being a murderer of a human personality. In order to reveal the ways in which the space-time characteristics serve the purpose, the semantic and syntactic levels of the texts (on which the various versions of the chronotope were realized) were distinguished, and the temporal and topographic models (on which the time-space structure of the works are based on) were studied.

The thesis points out that the chronotopical peculiarities are the consequent of the certain trends in the philosophy of Western Europe and the stylistic tendencies in the literature in the XX century, as well as of the personal experience of the author.

The results of the research can me applied for further studies of the chronotope nature in the literature and for developing study materials on history of foreign (Austrian in particular) literature of the XX century.